## ПРЫВІТАННЕ
## ЎДЗЕЛЬНІКАМ КАНФЕРЭНЦЫІ МІНІСТРА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ВАСІЛЯ СТРАЖАВА

*Шаноўныя госці,*
*паважаныя ўдзельнікі Міжнароднай навуковай канферэнцыі!*

*Вітаю вас на беларускай зямлі, на радзіме геніяльнага паэта Адама Міцкевіча, 200-годдзе з дня нараджэння якога адзначае сусветная грамадскасць!*

*У Беларусі юбілей вялікага паэта і асветніка мы адзначаем з асаблівай пашанай і гонарам. Тут Адам Міцкевіч нарадзіўся, тут, каля старажытнага Навагрудка, узмужнеў талент слаўнага прадстаўніка славянскай і сусветнай літаратуры.*

*Постаць Адама Міцкевіча, яго непераўзыдзеная творчасць, жыццё падзвіжніка і асветніка сталі адным з самых вялікіх здабыткаў сусветнай, у тым ліку і беларускай, культуры, невычэрпнай крыніцай духоўнасці беларускага народа.*

*Высокая мастацкая каштоўнасць твораў Адама Міцкевіча стала магутным падмуркам для стварэння беларускай нацыянальнай літаратуры, фарміравання талентаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча і іншых выдатных сыноў беларускага народа.*

*Адам Міцкевіч пакінуў для нашчадкаў не толькі свае выдатныя творы, але і павучальны прыклад патрыятычнага служэння Радзіме, што стварае самога чалавека і сваёй прыгажосцю аздабляе жыццё кожнай асобы. За сваю Айчыну, за яе свабоду Адам Міцкевіч змагаўся сваёй творчасцю і быў гатовы змагацца са зброяй у руках.*

*Геній Адама Міцкевіча заключаецца ў тым, што ён спалучыў жыццё зямное з Божай зоркай высокай паэзіі, тым самым узвялічваючы чалавека, праслаўляючы беларускі, польскі і літоўскі народы, аб’яднаныя раней у адзінай дзяржаве.*

*Я вітаю ўдзельнікаў канферэнцыі ад імя Урада Рэспублікі Беларусь, які ў сваіх намаганнях па развіццю нацыянальнай культуры асаблівую ўвагу надае засваенню маладым пакаленнем сваёй каштоўнай гістарычнай спадчыны. У гэтым агульным працэсе гуманізацыі грамадства, маральна-эстэтычнага выхавання асобы свабодалюбівыя ідэі Адама Міцкевіча набываюць сучаснае гучанне.*

*Вялікі класік сусветнай літаратуры прарочыў міралюбства, братэрства паміж суседнімі народамі. Гэта аксіёма яднання з асаблівым пранікненнем павінна быць асэнсавана ў наш складаны час, каб у агульнай сям'і розных народаў узняцца на новы ўзровень цывілізацыі.*

*А. С. Пушкін пісаў пра А. Міцкевіча:*

*Он говорил о временах грядущих,*
*Когда народы, распри позабыв,*
*В великую семью соединяться.*

*Шаноўныя калегі! Вялікаму Адаму Міцкевічу — 200 гадоў. Зорка яго таленту на небасхіле новай эпохі разгараецца ўсё ярчэй і ярчэй, і яна будзе асвятляць шлях нашым народам у XXI стагоддзе. Гэта свет гуманізму, дабра, справядлівасці, уладарнасці чалавека, яго розуму.*

*Вітаю вас з гадавінай нараджэння Адама Міцкевіча, класіка сусветнай літаратуры, прадстаўніка беларускай і польскай культур. Жадаю поспехаў канферэнцыі!*

KAMUNIKAT.org